« »

13 ліпеня ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава адбылося адкрыццё міжнароднай выставы “Прыцягненне. Беларуская і руская Поўнач”. У экспазіцыі прадстаўлены творчыя работы Дзіцячай школы народных рамёстваў (Архангельск, Расія) і студэнцкія дыпломныя работы кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі ВДУ. Гэта першая выстава ў рамках міжнароднай дамовы аб супрацоўніцтве паміж мастацка-графічным факультэтам ВДУ і Архангельскай дзіцячай школай народных рамёстваў, якое ў далейшым плануецца прадоўжыць.

« »

23 чэрвеня ў Віцебску, на пляцоўцы каля Ратушы, у рамках мерапрыемстваў, прымеркаваных да святкавання Дня горада, адбылося адкрыццё памятнага знака “Віцебск гістарычны”. Аўтар манументальна-дэкаратыўнай кампазіцыі, якая прадстаўляе сабой макет гістарычнай часткі Віцебска пачатку ХХ ст., старшы выкладчык кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава Сяргей Сотнікаў.

« »

З 27 чэрвеня па 31 ліпеня ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі (Ратуша, вул. Леніна, 36) экспануецца выстава работ двух вядомых беларускіх мастакоў Сяргея Сотнікава і Алега Захарэвіча. У экспазіцыі пад назвай “Пагружэнне ў вобраз” прадстаўлены жывапісныя палотны А. Захарэвіча і скульптурныя кампазіцыі старшага выкладчыка кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава С. Сотнікава.

« »

Студэнт педагагічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава з Кітайскай Народнай Рэспублікі Чжан Янь выступіў у якасці спецыяльнага госця на гала-канцэрце XXI Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу “Віцебск”, які праводзіўся ў рамках XXXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”. Чжан Янь з’яўляецца салістам вакальнага ансамбля кітайскіх студэнтаў педагагічнага факультэта “Integration” (кіраўнік – дацэнт кафедры музыкі Вольга Жукава).

« »

8 жніўня ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбылося ўрачыстае адкрыццё юбілейнай выставы заслужанага дзеяча мастацтваў нашай краіны, кандыдата мастацтвазнаўства, ганаровага прафесара Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, ганаровага акадэміка Расійскай акадэміі мастацтваў Уладзіміра Пракапцова “Пад знакам бясконцасці”. Выстава, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння У. Пракапцова і 25-годдзю яго работы на пасадзе генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, паказвае разнастайнасць творчых інтарэсаў аўтара як мастака, вучонага і арганізатара музейнай справы Беларусі. У экспазіцыі прадстаўлены больш за 35 работ з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Музея гісторыі горада Мінска, карпаратыўнай калекцыі ААТ “Прыёрбанк” і

асабістай калекцыі аўтара. Творчасць мастака характарызуецца арыгінальным пазнавальным стылем, глыбокім філасофскім зместам, сцвярджэннем вечных духоўных каштоўнасцей, зваротам да сваіх каранёў, любоўю да роднай зямлі, бацькоў. Карціны ўяўляюць сабой сплаў суб'ектыўна-лірычнага і рацыянальна-прагматычнага пачаткаў, што дае магчымасць раскрыць і паказаць на палатне парыў уласных пачуццяў і думак праз гарманічную завершанасць, кампазіцыйную, пластычную і колеравую арганізацыю твора. Сярод прадстаўленых палотнаў, пачынаючы з васьмідзясятых гадоў XX стагоддзя, – карціны розных жанраў: пейзажы, нацюрморты, партрэты, эпічныя творы, а таксама карціны, напісаныя ў час мастацкіх акцый у Віцебску.

На выставе ўпершыню прадстаўлены тры новыя карціны: "Настальгія", "Дарога дадому" і "Суладдзе зямнога і нябеснага. Памяці Веры" (партрэт Веры Пракапцовай). У экспазіцыі таксама можна ўбачыць кнігі У.І. Пракапцова, прысвечаныя вядомым майстрам Беларусі – Станіславу Жукоўскаму, Вітольду Бялыніцкаму-Бірулі, Фердынанду Рушчыцу і іншым, што ўвайшлі ў серыю выданняў "Славутыя мастакі з Беларусі", ініцыятарам якой ён з'яўляецца.

Наведвальнікі выставы змаглі ўбачыць таксама фільм, які Уладзімір Пракапцоў запісаў напярэдадні свайго развітання з музеем. У гэтым фільме ён расказвае пра самыя знакавыя праекты і самыя цікавыя моманты дзейнасці ў роднай установе.

« »

25 жніўня ў Гарадоцкім краязнаўчым музеі пачала працаваць выстава "Мой родны кут" выкладчыкаў кафедры выяўленчага мастацтва мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава (куратар В. Осіпаў). У экспазіцыі прадстаўлена больш за 40 твораў, якія выкананы ў розных тэхніках: графіцы, акварэлі, пастэлі, алейным жывапісе. Працягам і развіццём выставы з'явіўся "круглы стол" "Слова і жывапіс", за прайшоў у сталіцы Дня беларускага пісьменства з удзелам выкладчыкаў кафедры выяўленчага мастацтва мастацка-графічнага факультэта і пісьменнікаў з Беларусі і Расіі.

« »

Да 30-га юбілейнага Свята беларускага пісьменства, якое адбылося 2–3 верасня ў Гарадку на старчаку дома (вуліца Савецкая, 20), які глядзіць на галоўную плошчу райцэнтра, творчай групай на чале са старшым выкладчыкам кафедры дызайну ВДУ А. Сяргеевым, быў распрацаваны і выкананы мурал з выявамі гербаў гарадоў, якія ў розныя гады ўдастойваліся гонару прымаць Дзень пісьменства.

« »

7 верасня ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбылося ўрачыстае адкрыццё персанальнай выставы прафесара кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі, вядомага беларускага мастака Вячаслава Шамшура. У экспазіцыі пад назвай "У суладдзі душэўнасці і цеплыні" глядач можа ўбачыць жывапісныя кампазіцыі майстра, якія выкананы ў розны час у алейнай тэхніцы і пастэлі мастака. Сярод большасці твораў В. Шамшура краявіды, прысвечаныя Бацькаўшчыне.